УТВЕРДИ, БОЖЕ, СВЯТУЮ ПРАВОСЛАВНУЮ ВЕРУ, ПРАВОСЛАВНЫХ ХРИСТИАН ВО ВЕК ВЕКА!

Царкоўнае слова

Беларускі праваслаўны штотыднёвік.
Выдаецца з красавіка 1992 года.

11 ліпеня
28 (318), 2008 г.

17 июля 90 ЛЕТ СО ДНЯ МУЧЕНИЧЕСКОЙ КОНЧИНЫ ЦАРСКОЙ СЕМЬИ

Эмалевый крестик в петлице
И серой тужурки сукно...
Какие прекрасные лица,
И как это было давно.
Какие прекрасные лица,
Но как безнадежно бледны
Наследник, Императрица,
Четыре Великих Княжны.

Георгий Иванов

Читайте материал на с.8

ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ:

НА ПОЛІ БІТВЫ І МАЛІТВЫ 2

У мінулым годзе ў Лясной пабывалі шведскія турысты. Сярод іх былі ўдзельнікі гістарычнага клуба пад кіраўніцтвам адстаўнога генерала. Наведаўшы храм у Лясной, ён сказаў: «Нашы продкі самаўпэўнена думалі, што з імі Бог. Тут, у Лясной, аказалася, што — наадварот».

ІКОНА БОЖАЙ МАЦІ «ГРУЗДАЎСКАЯ» 6

Груздаўскае паданне распавядае, як пасля бітвы паміж дружынамі князёў Жыгімонта і Свідрыгайлы поле было засеяна целамі забітых, сярод іх быў цяжка паранены смаленскі стараста Андрэй Саковіч. Губляючы прытомнасць, ён убачыў каля сябе на паваленым дрэве ікону Божай Маці…

КАК ПРИЧАЩАЛИСЬ ДРЕВНИЕ ХРИСТИАНЕ 10

Причащение первых христиан весьма походило на причащение апостолов Иисусом Христом. Прежде всего, хлеб евхаристический после благословения преломлялся, отсюда самое таинство причащения Тела и Крови Господа называлось «преломление хлеба».

Календарь

13 июля

Неделя 4-я по Пятидесятнице. Собор славных и всехвальных 12-ти апостолов. Преподобного Петра, царевича Ордынского (1); святителя Софрония, епископа Иркутского (2).
Рим. 6, 18-23; 1 Кор. 4, 9-16. Мф. 8, 5-13; Мк. 3, 13-19.

14 июля

Мучеников бессребреников Космы и Дамиана; священномученика Аркадия пресвитера; священномученика Алексия диакона; мученика Потита; преподобного Петра; праведной Ангелины, деспотисы Сербской (на иконе).
Рим. 12, 4-5, 15-21; 1 Кор. 12, 27 – 13, 8. Мф. 12, 9-13; Мф. 10; 1, 5-8.

15 июля

Положение честной ризы Пресвятой Богородицы во Влахерне (1); Пожайской (2), Феодотьевской и Ахтырской икон Божией Матери.
Рим. 14, 9-18; Евр. 9, 1-7. Мф. 12, 14-16, 22-30; Лк. 10, 38-42; 11, 27-28.

16 июля

Святителя Филиппа, митрополита Московского и всея России, чудотворца; святителя Василия, епископа Рязанского (1); святителя Анатолия, патриарха Константинопольского (2).
Рим. 15, 7-16; Евр. 13, 17-21. Мф. 12, 38-45; Ин. 10, 9-16.

17 июля

Страстотерпцев царя Николая, царицы Александры, царевича Алексия и великих княжен; преподобного Евфимия Суздальского (1); Галатской иконы Богоматери (2).
Рим. 15, 17-29; 8, 28-39; Евр. 13, 7-16. Мф. 12, 46 – 13, 3; Ин. 15, 17 – 16, 2; Лк. 6, 17-23.

18 июля

Преподобного Афанасия Афонского (1); преподобного Сергия Радонежского; преподобномучениц великой княгини Елисаветы и инокини Варвары; иконы Богоматери «Экономисса» (2).
Рим. 16, 1-16; Гал. 5, 22 – 6, 2; 2 Кор. 6, 1-10. Мф. 13, 4-9; 15, 21-28; Лк. 6, 17-23.

19 июля

Собор Радонежских святых; преподобного Сисоя Великого; **праведной Иулиании Ольшанской;** мучеников Марина, Марфы, Авдифакса, Аввакума (на иконе), Кирина, Валентина пресвитера, Астерия; Богородско-Уфимской иконы Божией Матери.
Рим. 8, 14-21; Гал. 5, 22 – 6, 2. Мф. 9, 9-13; Лк. 6, 17-23.

12 ліпеня

100 год закладкі храма-помніка ў Лясной

Удзень прастольнага свята Петра-Паўлаўскага храма-помніка вёскі Лясная Слаўгарадскага раёна Магілёўскай епархіі пачынаюцца юбілейныя ўрачыстасці ў гонар 300-годдзя Ляснянскай бітвы.

Свята-Петра-Паўлаўскі храм-помнік на полі Ляснянскай бітвы быў закладзены 100 гадоў таму назад падчас юбілейных урачыстасцей 1908 года. Тады ж у Лясной стварылі мемарыяльны комплекс, які ўключаў яшчэ адзін храм — драўляны Прачысценскі («царскі», «Пятроўскі»), адмысловы цагляны будынак царкоўнапрыходскай школы, а таксама абеліск на брацкай магіле загінуўшых і помнік у гонар перамогі. Жорсткае XX стагоддзе нанесла мемарыялу істотныя страты. Але прыгажун-храм змог захавацца і сёння годна ўзвышаецца над полем бітвы, якое ўжо тры стагоддзі перш за ўсё з'яўляецца месцам малітваў.

Анаогул гісторыя Праваслаўнай Царквы на Слаўгарадчыне сягае да часоў святога роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра — хрысціцеля Русі. У канцы X стагоддзя кіеўскі ваявода Воўчы Хвост разбіў войска старажытных жыхароў Пасожжа радзімічаў на рацэ Пясчанцы ў наваколлі сучаснага Слаўгарада. Неўзабаве пасля гэтага радзімічы прынялі святое хрышчэнне ў крыніцы «Сіні калодзеж», якая раней была іхнім галоўным язычніцкім свяцілішчам. Больш за тысячагоддзе гэтая унікальная мясціна штогод збірае тысячы паломнікаў у дзень гістарычнага Хрышчэння Русі — 1/14 жніўня. Нядаўна там адноўлена Свята-Макавееўская капліца, прыпісаная да Ляснянскай прыходскай царквы. Верагодна, у XII стагоддзі горад Слаўгарад (тады Прупой) стаў цэнтрам прыхода. На такое меркаванне схіляе тэкст граматы 1136 года, дадзенай святым князем Расціславам-Міхаілам Смаленскай епіскапіі. З XVI-XVII стагоддзяў вядомыя некалькі прыходаў тагачаснай Прапойскай воласці, якія былі аб'яднаны ў пратапопію і доўга вытрымлівалі націск уніятаў. Сярод іх была могільнікавая цэркаўка ў Лясной, прыпісная да прыхода суседняга сяла Рабавічы. Спадкаемца гэтай святыні — сённяшні юбіляр Петра-Паўлаўскі храм-помнік.

З гісторыяй Ляснянскай царквы звязаны імёны многіх слынных людзей. Гэта імператары Пётр I, Аляксандр III і святы страстацерпец Мікалай II, свяціцель Георгій (Каніскі), свяшчэннамучанік Мітрафан (Краснапольскі), вядомы археолаг і этнограф Е. Р. Раманаў... Кожны з іх зрабіў свой унёсак для таго, каб месца, палітае крывёю тысяч воінаў, не было занядбана.

Першым парупіўся ў справе пабудовы храма цар Пётр, які асабіста кіраваў расійскімі войскамі на полі Ляснянскай бітвы. Ён стаў сведкам таго, як могільнікавую цэркаўку ў Лясной шведскі генерал Левенгаўпт зрабіў сваім назіральным пунктам. У выніку жорсткага абстрэлу шведскіх пазіцый будынак царквы быў знішчаны. Цар Пётр, дасягнуўшы пры Лясной сваёй галоўнай мэты — захопу шведскага абозу, распарадзіўся ў першую чаргу аддаць падзяку Богу і ўзнавіць разбураны бітваю храм. Літаральна за некалькі дзён драўляную царкву пабудавалі воіны-пераможцы. Паколькі бітва адбылася перад святам Пакрова Божай Маці, храм быў асвячоны ў гонар Прасвятой Багародзіцы. У народзе ж яго часцей за ўсё называлі «царскім», або «Пятроўскім», падкрэсліваючы гэтым памяць аб стваральніку. Лёс царквы быў няпросты. У сярэдзіне XVIII стагоддзя мясцовы пан загадаў разабраць будынак і перанесці ў маёнтак Галавенчыцы кіламетраў за 30 ад Лясной. Там храмам завалодалі уніяты. Магілёўскі свяціцель Георгій (Каніскі) пратэставаў супраць такога гвалту, але пры польскай уладзе ён не здолеў дасягнуць справядлівасці. Толькі пасля раздзелу Рэчы Паспалітай праваслаўныя змаглі вярнуць сваю святыню. Аднак храм яшчэ доў-

НА ПОЛІ БІТВЫ І МАЛІТВЫ

Увосень 1708 года закінутая сярод лясоў і балот вёсачка Лясная каля горада Прапойска (Слаўгарада) набыла шырокую вядомасць. 28 верасня (11 кастрычніка па новым стылі) тут адбылася бітва рускіх са шведамі, якая закончылася першай буйной перамогай праваслаўнага воінства ў час Паўночнай вайны. Роўна праз 9 месяцаў пасля Ляснянскага бою шведскае войска было разгромлена пад Палтавай. Таму цар Пётр Першы назваў перамогу пры Лясной «маці Палтаўскай баталіі».

га знаходзіўся ў Галавенчыцах. Толькі пасля 1905 года дзякуючы намаганням Е. Р. Раманава (1855-1922) ён вярнуўся на першапачатковае месца ў Лясную. На жаль, пасля рэвалюцыі 1917 года бязбожнікі знішчылі гэты унікальны помнік. Да нашага часу цудам дайшоў толькі адзін абраз з іканастаса, які пасеклі сякерамі і спалілі.

У канцы XIX стагоддзя Еўдакім Раманаў настойліва дамагаўся пабудовы на месцы Ляснянскай бітвы велічнага храма-помніка. Вучоны дайшоў нават да імператара Аляксадра III, які ўхваліў ідэю. Ажыццявіў жа яе апошні расійскі імператар Мікалай II. Ён распарадзіўся правесці ў 1908 годзе ўсерасійскія ўрачыстасці ў Лясной. На пабудову храма было ўнесена ад царскай сям'і 1000 рублёў асабістых ахвяраванняў, а затым прысланы ў дар камплект званоў.

Закладку Свята-Петра-Паўлаўскага храма-помніка і асвячэнне яго здзейсніў вікарый Магілёўскай епархіі епіскап Гомельскі Мітрафан. З 1912 года ўладыка кіраваў Мінскай епархіяй. У 1919 годзе быў забіты ў Астрахані. Зараз архіепіскап Мітрафан праслаўлены са святымі. Імя свяшчэннамучаніка ўнесена ў лік Сабору Беларускіх святых.

Ляснянскі храм-помнік надзвычай прыгожы. Знешне ён нагадвае крамлёўскую вежу. На фасадзе зроблены 2 мазаікі — Казанскай іконы Божай Маці над уваходам і святога апостала Пятра на алтарнай сцяне. Казанскі цудатворны абраз, як вядома, суправаджаў расійскія войскі падчас ваенных паходаў. Быў ён і на полі Ляснянскай бітвы.

Іншай мясцовашанаванай святыняй у Лясной была некалі Толгская ікона Божай Маці. 100 гадоў таму назад з благаславення архіепіскапа Яраслаўскага Ціхана (пазней — Свяцейшы Патрыярх) спіс Толгскай іконы прывезла ў Лясную яраслаўская дэлегацыя, што брала ўдзел ва ўрачыстасцях. Пасля закрыцця царквы ў 1930-я гады святыня знікла.

Зараз у Ляснянскім прыходзе асабліва шануецца Пачаеўская ікона Прачыстай Багародзіцы. Справа ў тым, што пасля Вялікай Айчыннай вайны мясцовы жыхар — партызан і франтавік В. К. Трамбіцкі ажыццявіў сваё абяцанне, дадзенае Богу падчас вайны, і стаў манахам Пачаеўскай Лаўры. Пры Хрушчове некалькі разоў улады спрабавалі зачыніць Лаўру, таму арыштоўвалі і разганялі яе насельнікаў. Манах Варнава (Трамбіцкі) вымушана вярнуўся на радзіму. Дзякуючы яму ў Лясной у самыя змрочныя часы не перапыняўся подзвіг посту і малітвы. Таксама ён устанавіў асаблівае шанаванне Пачаеўскай іконы.

Айцу Варнаве Гасподзь спадобіў дажыць да адраджэння Свята-Петра-Паўлаўскага храма-помніка. Пасля таго як будынак пабываў у якасці калгаснага свірна, а потым філіяла краязнаўчага музея, які ў сярэдзіне 1980-х гадоў зачыніўся на бясконцы рамонт, у 1991 годзе ён нарэшце вярнуўся да сваёй законнай уладальніцы — праваслаўнай абшчыны. Пры гэтым не прайшлі бясследна малітвы і спадзяванні многіх людзей, што клапаціліся аб адраджэнні святыні. У ліку іх і наш Мітрапаліт Філарэт. У маі 1989 года ён наведаў Лясную і выказаў надзею на адкрыццё мемарыяльнай царквы. Тады для жыхароў Слаўгарадскага раёна, найбольш пацярпелага пасля чарнобыльскай катастрофы, такая падтрымка была надзвычай важная.

Жыццё на знявечанай Чарнобылем зямлі не спынілася. Сёння сюды зноў прыязджае мноства людзей. Храм-помнік засяроджвае ўвагу наведвальнікаў Ляснянскага мемарылу на неабходнасці сцішанай малітвы на месцы, палітым крывёю тысяч людзей. Дзеючы храм перакрэслівае штучны пафас турыстычных аб'ектаў, за прывабнымі абалонкамі якіх нярэдка хаваюцца ўнутраныя холад і пустэча. Дзякаваць Богу, зараз поле Ляснянскай бітвы не дае нам такіх непрыемных уражанняў. А вось пытанні да мемарыяльных храмаў у іншых мясцінах Магілёўшчыны, на жаль, ёсць. Гэта датычыцца месцаў бітвы пры Салтанаўцы ў 1812 годзе і Буйніцкага поля абароны 1941 года.

Сучасны прыход Свята-Петра-Паўлаўскага храма-помніка ў Лясной не цураецца грамадска-асветніцкай працы. У 2002 годзе тут прайшлі краязнаўчыя чытанні, прысвечаныя Е. Р. Раманаву. Некалькі гадоў у храме існуе вельмі цікавая экспазіцыя «Старонкі гісторыі». Некаторыя яе экспанаты былі прадстаўлены ў Шклове падчас мінулагодняга свята беларускага пісьменства і друку.

Сёлета ў Лясной будуецца аграгарадок. Вёска з'яўляецца адной вялікай будаўнічай пляцоўкай. Нарэшце знайшліся сродкі для заканчэння капітальнага рамонту храма, які амаль 10 гадоў стаіць «у цярновым вянку рыштаванняў», па вобразных словах магілёўскай журналісткі. Аднак прастольнае свята не чакае завяршэння рамонту. У прыходзе некалькі іншае стаўленне да юбілею, у адрозненні ад некаторых чыноўнікаў, якім «трэба правесці мерапрыемства», а пасля — хоць трава не расці яшчэ 100 гадоў...

Спадзяёмся, што з Божай дапамогаю пакрысе храм-помнік будзе дапамагаць людзям спыніцца ў тлумнай мітусні і задумацца над вечным. Яскравы прыклад адбыўся ў мінулым «неюбілейным» годзе. У Лясную тады прыехалі шведскія турысты. Сярод іх былі ўдзельнікі гістарычнага клуба пад кіраўніцтвам адстаўнога генерала. Госці са Швецыі стараліся вызначыць дэталі бою, месцы дыслакацыі войск і г.д. Усё гэта з шумам абмяркоўвалася. Але потым турысты зайшлі ў храм. Гоман сціх — і ўстанавілася цішыня. Стары генерал сказаў: «Нашы продкі самаўпэўнена думалі, што з імі Бог. Тут, у Лясной, аказалася, што — наадварот». Шведы моўчкі пастаялі, а потым папрасілі нашых прыхаджан праспяваць нешта з ліку «рускіх малітваў». У адказ яны пачулі трапар святым першавярхоўным апосталам Пятру і Паўлу. Перакладчык растлумачыў гасцям, што «гэтая малітва кожны раз спяваецца ў царкве і змяшчае прашэнне аб тым, каб ва ўсім свеце быў мір». У знак згоды шведы дружна заківалі галовамі.

Протаіерэй Георгій САКАЛОЎ,
настаяцель прыхода

УДЕЛЯТЬ БОЛЬШЕЕ ВНИМАНИЕ ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ ЛЮДЕЙ, ЧЕМ СТРОИТЕЛЬСТВУ ХРАМОВ

О важности личного общения духовенства с верующими напомнил в докладе на Архиерейском Соборе митрополит Калужский и Боровский Климент, управляющий делами Московской Патриархии: «Никакая серьезная работа по приобщению людей к вере невозможна без личного общения настоятеля, духовенства, а также сотрудников храма с прихожанами, и особенно с теми нашими согражданами, кто только еще находится на пути богоискания и не обрел единства со Христом через исповедание Православия, жизнь по заповедям и участие в богоустановленных Таинствах».

Владыка Климент подчеркнул, что нередко приход человека в храм связан с поиском ответа на важные мировоззренческие вопросы, поэтому отсутствие живого контакта со священством, невозможность услышать вразумительные ответы зачастую подталкивает человека к поиску истины в иных конфессиях или даже иных религиозных движениях.

Также митрополит Климент подчеркнул важность общения постоянных прихожан храмов с духовенством: «Наши постоянные прихожане не должны быть лишены возможности живого общения со священством, дабы разговор между пастырем и пасомым не сводился только к перечислению грехов на исповеди и получению епитимии».

Кроме того, митрополит Климент призвал уделять большее внимание духовной жизни людей, чем строительству храмов, ведь в наше время особую актуальность приобретает вопрос возвращения соотечественников к вере. Владыка заявил о необходимости корректировки целей, которые стоят сегодня перед Церковью и которые в большинстве своем были намечены еще 20 лет назад.

«Не отрицая важнейшего значения созидания и благоукрашения храмов, все же думается, что сегодня нам следует гораздо больше внимания уделять теме внутреннего просвещения. Вполне благое и оправданное стремление к утолению духовной жажды нашего общества привело к тому, что сотни тысяч или даже миллионы наших соотечественников вошли в Церковь, стали православными христианами, приняв Крещение, но при этом они не получили необходимых знаний о пути ко спасению и не имеют достаточного духовного опыта», — подчеркнул владыка.

Иерарх напомнил о положении Миссионерской концепции Русской Православной Церкви, согласно которому каждый приход должен быть максимально ориентирован на миссионерскую деятельность. При этом, по словам митрополита, «миссионерство должно заключаться не в реформировании, изменении богослужения и церковных традиций, но в изменении самих себя и своего отношения к людям, приходящим в наши храмы».

Миссионерские задачи, по словам митрополита Климента, должны стоять как перед приходскими храмами, так и перед монастырями, которые призваны стать не только тихими пристанищами для ищущих спасения, но и образцовыми духовными центрами, заботящимися о развитии паломничества, бережно хранящими литургические обычаи и традиции душепопечения.

Владыка Климент критически оценил распространившиеся принципы организации образования и воспитания в воскресных школах. «Воскресные школы, в виде места для заучивания наизусть молитв и штудирования учебника по Закону Божию, очевидно, должны уступить место иным формам и методам занятий», — подчеркнул владыка.

Митрополит Климент призвал епархии и приходы искать новые пути приобщения современников к Православию. Владыка с сожалением указал на то, что нередко учащиеся воскресных школ, вырастая, перестают посещать храмы, теряют интерес к вопросам веры и духовности.

«Чаще всего это происходит по причине отвлеченности преподаваемых на занятиях в воскресной школе знаний от насущной деятельности приходской общины. Попросту говоря, молодой человек, получив некоторый багаж информации, остался по сути своей человеком невоцерковленным, поскольку преподавание не было сопряжено с непосредственным участием в богослужебной, социальной или какой-то иной деятельности прихода», — подчеркнул владыка.

В докладе митрополит Климент также отметил, что воскресные школы не смогли дать многочисленным учащимся прошедших десятилетий внутреннего духовного фундамента. Преодоление этой проблемы, по словам иерарха, будет содействовать тому, что выпускники воскресных школ станут активными участниками приходской и общественной жизни, обладающими твердой христианской позицией по важным вопросам.

Кроме того, митрополит Климент призвал духовенство не замыкаться в кругу личных интересов: «Хотелось бы, чтобы не только настоятели храмов, но и сами архипастыри подавали добрый пример доступности и личной заинтересованности в утолении духовных нужд православных христиан».

Владыка Климент подчеркнул важность братского общения между приходами, общинами и их руководителями, указав на то, что ряд священнослужителей, восстановив храм и сделав приход обеспеченным, утрачивают интерес к приходской жизни: «Всякому правящему архиерею хорошо известно, что такие настоятели совершенно не интересуются тем, как организована жизнь на других приходах, какие там используются методы работы с молодежью, в социальной сфере, в области катехизации и воцерковления, в решении сложных пастырских вопросов. О том, что духовное горение такими отцами утеряно, красноречиво свидетельствует почти полное отсутствие их чад в духовных школах нашей Церкви, а тот, «кто не умеет управлять собственным до-

мом, тот будет ли пещись о Церкви Божией?» (1 Тим. 3, 5)».

Митрополит Климент также указал на недопустимость того, чтобы недавно рукоположенный священник, назначенный в известный, почитаемый храм, смотрел свысока на своих собратьев, получивших менее престижное место служения. Главным способом преодоления межприходского отчуждения управляющий делами Московской Патриархии считает епархиальные собрания, которые можно проводить чаще, чем раз в год, а также пастырские собрания под председательством благочинного.

«Как известно, учителя светских школ раз в несколько лет проходят курсы усовершенствования, а врачи — и вовсе обязательную переаттестацию. Тем очевиднее нужны такие «пастырские курсы» для духовных учителей и врачей, от которых зависит духовное здравие и вечная жизнь пасомых», — заявил владыка Климент.

Митрополит подчеркнул, что на духовенстве лежит особая ответственность за противодействие невежеству и заблуждениям в среде православного народа. «При отсутствии непосредственного проникновения настоятеля и духовенства в проблемы, волнующие прихожан, возникает возможность распространения в приходской среде опасных суеверий, ложных мнений, а иногда и откровенно антиерархических настроений». Владыка Климент также указал на то, что напрямую с этой проблемой связан и выбор литературы для продажи в православных храмах: «Иногда в церковных лавках невозможно найти Нового Завета, зато — полная подборка брошюр сомнительного содержания самого широкого спектра, начиная от знахарских советов относительно исцеления от различных болезней и заканчивая живописанием самых невообразимых пророчеств об антихристе и последних судьбах мира».

Митрополит Климент указал на необходимость строгого контроля этой сферы приходской жизни и личной, в том числе дисциплинарной, ответственности настоятеля за содержание продаваемых в храмах книг и брошюр.

«Очевидно, что в тех церковных лавках, где объем предлагаемой литературы достаточно велик, настоятель не в силах лично прочитать каждую из выложенных книг, но хотя бы бегло просмотреть их содержание, уточнить выходные данные, думается, всем вполне под силу», — подчеркнул владыка Климент.

4 июля

КИЕВ

На установлении государственного праздника Крещения Руси в день памяти святого равноапостольного князя Владимира (28 июля) настаивает Украинская Православная Церковь. «Предоставление этому празднику статуса государственного сможет помочь консолидации народа Украины», — сказал на пресс-конференции управляющий делами УПЦ МП архиепископ Белоцерковский и Богуславский Митрофан. Он добавил, что это улучшит отношения с Россией и Беларусью.

Президент Украины Виктор Ющенко также считает, что празднование Крещения Руси объединит страну. Своим указом он учредил оргкомитет по празднованию в стране 1020-летия Крещения Руси. Главой оргкомитета назначен первый президент Украины (1991-1994) Леонид Кравчук. Вместе с тем в указе Ющенко не называется конкретная дата празднования Крещения Руси, не идет речь о том, чтобы сделать какой-либо из дней соответствующим праздником.

Архиепископ Митрофан сообщил, что Священный Синод УПЦ неоднократно обращался с инициативой учреждения праздника в государственные органы, но не получил ни устных, ни письменных ответов.

Важно отметить, что торжества по случаю 1020-летия Крещения Руси, которые пройдут с 10 июля до середины августа, намерен посетить Константинопольский Патриарх Варфоломей. Президент страны Виктор Ющенко направил лично Патриарху Варфоломею I (так же как и предстоятелям других Поместных Церквей) предложение «возглавить вышеупомянутые торжества», говорится в официальном сообщении Константинопольского Патриархата. Священный Синод в Константинополе на очередном заседании 23-25 июня, «оценив данные приглашения от Церкви, от государства и от народа Украины и уважая их чувства, определил, чтобы Церковь-Мать, которая привела украинский народ к Крещению, ответила на вышеуказанные приглашения, отправив патриаршую делегацию, возглавляемую Его Всесвятейшеством», отмечается в сообщении.

В. Ющенко направил приглашения принять участие в праздновании 1020-летия Крещения Киевской Руси главам всех Поместных Православных Церквей. «Мы ожидаем, что в ближайшее время много делегаций подтвердят свое участие в праздничных мероприятиях», — сказал Ю. Богуцкий, представитель администрации Президента Украины.

Готовность возглавить делегацию Русской Православной Церкви на торжествах в Украине в апреле подтвердил Святейший Патриарх Алексий II, который с 1997 года не был в этой стране.

Сообщение о том, что Константинопольский Патриарх Варфоломей I посетит Украину, «внимательно изучается» в Русской Церкви, заявил секретарь ОВЦС МП по межправославным отношениям протоиерей Николай Балашов. «Будут проведены необходимые консультации. До их завершения мы не будем комментировать решение Святейшего Патриарха Константинопольского», — сказал он. Некоторое время назад, когда стало известно о приглашении украинским президентом Патриарха Варфоломея, в Русской Церкви напомнили, что приглашение Константинопольского Патриарха на празднование 1020-летия Крещения Руси, по церковным правилам, должно исходить от Патриарха Московского и всея Руси. Прошедший на прошлой неделе Архиерейский Собор Русской Православной Церкви выразил озабоченность действиями Константинопольского Патриархата на ее канонической территории в ряде стран, в том числе в Украине. Участники Собора напомнили Константинополю о недопустимости отступления от незыблемых устоев межцерковных отношений, отметив, что игнорирование канонов приводит к «опасным последствиям для единства Православия».

Торжества на Украине по случаю 1020-летия Крещения Руси намерены посетить предстоятели ряда Поместных Православных и инославных Церквей. В частности, есть подтверждение готовности посетить Украину предстоятелями Иерусалимской, Кипрской, Александрийской Православных и Армянской Апостольской Церкви.

ВАТИКАН

Папа Римский Бенедикт XVI принял приглашение белорусского президента Александра Лукашенко посетить Беларусь, сообщает портал Православие.ру. Понтифик дал положительный ответ во время церемонии вручения им паллия (части литургического облачения) митрополиту Минско-Могилевскому Тадеушу Кондрусевичу в Ватикане. «Если мне Бог позволит, то да», — процитировали в эфире Первого телеканала Беларуси слова Бенедикта XVI. Как ранее сообщалось, А. Лукашенко передал приглашение Папе Римскому посетить страну в удобное для него время через госсекретаря Ватикана кардинала Тарчизио Бертоне, который в июне этого года пребывал в республике с официальным визитом.

2 июля

КИЕВ

Продолжается всеукраинский крестный ход, посвященный 1020-летию Крещения Руси. Крестный ход, который проходит с перерывами уже несколько месяцев, совершается со святынями, в числе которых икона Божией Матери «Успение» из домовой церкви митрополита Киевского и всея Украины, икона «Призри на Смирение» из Киевского Свято-Введенского монастыря, которая известна своим чудесным отображением на стекле киота, икона святителя Феодосия Черниговского с мощами святого — непримиримого борца с ересями и расколами, ковчег с мощами крестителя Руси — святого равноапостольного князя Владимира, две новые иконы «Крещение Руси» и другие святыни.

После крестного хода иконы «Крещение Руси» от имени всех верующих, молившихся пред ними, будут переданы в дар: одна — Блаженнейшему Митрополиту Киевскому и всея Украины Владимиру для строящегося в Киеве нового кафедрального собора, другая — Святейшему Патриарху Московскому и всея Руси Алексию II в память о посещении Украины Его Святейшеством в 1020-ю годовщину Крещения Руси.

ЯПОНИЯ

Религиозные деятели разных стран предложили пути выхода из продовольственного кризиса. 3-4 июля 2008 года в Саппоро (Япония) состоялось очередное заседание Управляющей коллегии Всемирной конференции религий за мир (ВКРМ). Обсуждались итоги работы этой крупнейшей межрелигиозной организации за последнее время, а также планы ее деятельности и развития на 2008-2011 годы. Среди участников заседания был заместитель председателя Отдела внешних церковных связей Московского Патриархата протоиерей Всеволод Чаплин.

Управляющая коллегия сделала заявление «Продовольственный и энергетический кризис: вызовы для борьбы с бедностью и охраны Земли». В заявлении, приуроченном к саммиту «Большой восьмерки», религиозные деятели призвали правительства, межгосударственные организации и бизнес-сообщество к срочным действиям по преодолению продовольственного кризиса. «Мир может прокормить своих людей, и мы должны не ждать, а действовать!» — говорится в документе.

По данным, приводимым в заявлении, на пропитание 862 миллионов людей, страдающих от нынешнего кризиса, требуется 30 миллиардов долларов. При этом избыточное потребление пищи полными людьми всего мира стоит 20 миллиардов долларов, а в одной из стран выбрасывается продуктов примерно на 100 миллиардов. Документ отмечает, что субсидирование аграрного сектора в США и Европе ставит в неравное положение сельское хозяйство бедных стран, где фермеры остро нуждаются в инвестициях, направленных на инновационные разработки.

Согласно заявлению, растущие цены на топливо имеют разрушительные последствия для борющихся с кризисом национальных экономик. В связи с этим ВКРМ предложила искать альтернативные источники энергии, которые не приводили бы к уменьшению производства продуктов питания. В частности, заявление содержит призыв увеличить производство «более чистого биотоплива, производство которого не входило бы в конфликт с производством пищи, помогало бы энергетическому самообеспечению бедных стран и создавало бы там рабочие места».

7 июля

ВЕЛИКОБРИТАНИЯ

Решение о возведении женщин в епископский сан принял заседающий в Йорке Генеральный синод Англиканской Церкви. Все три составные палаты синода — представляющие епископов, священников и мирян, — проголосовали за эту новую для исторической Церкви Англии норму. Решение, открывающее для женщин путь в епископат, было принято после ожесточенных дебатов, продолжавшихся весь день. В целом по данной проблеме выступили 70 человек.

В результате упорной борьбы противники возведения женщин на епископский престол потерпели полное поражение. Предложенный руководством Англиканской Церкви компромисс — создание особых епархий, которые не могут возглавляться женщинами, был отвергнут.

В результате, отмечает радиокомпания Би-би-си, усилилась угроза раскола Англиканской Церкви Англии. Тем не менее, руководству Церкви в лице Архиепископа Кентерберийского удалось добиться небольшой уступки со стороны жестких сторонников расширения прав женщин. Синод постановил, что вновь соберется в феврале будущего года и рассмотрит возможность внесения в уставные документы Англиканской Церкви положения, устанавливающего определенные условия работы епархий, возглавляемых женщинами.

Калі падарожнічаеш па Беларусі, то заўважаеш, што ў многіх храмах на ганаровых месцах размяшчаюцца мясцовашанаваныя іконы Прасвятой Багародзіцы. Іх паходжанне часта звязваецца з паданнем, якое як каштоўная духоўная спадчына перадаецца ад бацькоў дзецям, з пакалення ў пакаленне. Нярэдка з фактам з'яўлення іконы звязаны рэальныя гістарычныя падзеі і канкрэтныя асобы, што пацвярджаецца і гістарычнымі крыніцамі.

Паміж вёскамі Груздава і Капачы ў Маладзечанскім раёне знаходзіцца раўнінная мясцовасць, калісьці названая Чырвонай Валокай. Паводле старажытнага падання, такую назву поле мае з часоў княжых міжусобіц, калі «брат ішоў на брата і бацька на сына». У 1433 годзе сышліся тут у сечы дружыны князёў Жыгімонта і Свідрыгайлы. Бітва была такой жорсткай, што зямля стала барвовай ад пралітай чалавечай крыві. Гэтая гістарычная падзея, як сведчаць мясцовыя людзі, мела працяг, які паўплываў на далейшае жыццё Груздава і многіх пакаленняў яго насельнікаў.

Згодна з паданнем, у той бітве на баку Свідрыгайлы змагаўся рыцар Андрэй Саковіч. Адзначым, што гэтае імя неаднойчы сустракаецца ў гістарычных дакументах. Пачынальнікам роду Саковічаў быў князь Сак, які ў падзеях, звязаных з Гарадзельскай уніяй 1413 года, выступаў з імем Станіслаў і належаў да гербу Памян. Але найбольш знакамітым прадстаўніком роду стаў яго сын Андрэй (?–1465), буйны землеўласнік, які займаў высокія дзяржаўныя пасады, меў талент военаначальніка і дыпламата. Падчас міжусобнай вайны Андрэй Саковіч спачатку падтрымаў бок Свідрыгайлы, але пасля бітвы пад Ашмянамі ў 1432 годзе перайшоў пад харугвы Жыгімонта Кейстутавіча.

Груздаўскае паданне распавядае, як пасля бітвы на Чырвонай Валоцы поле было засеяна целамі забітых, сярод іх быў цяжка паранены Андрэй Саковіч. Губляючы прытомнасць, ён убачыў каля сябе на паваленым дрэве ікону Божай Маці, якую ўзяў і як мог прыціснуў да грудзей. Мясцовыя людзі і раней часам бачылі на гэтым месцы выяву Божай Маці, якая з'яўлялася на дрэве.

На наступны дзень на месца бітвы прыйшлі сяляне, каб сабраць і пахаваць целы забітых. Яны знайшлі непрытомнага рыцара і, прыняўшы яго за памерлага, паспрабавалі адняць ікону, але расчапіць рукі не ўдавалася. І тут князь падаў прыкметы жыцця. Сяляне перавезлі яго ў вёску, дзе князь хутка ачуняў. Андрэй Саковіч з удзячнасцю прымаў дапамо-

Святыні Беларусі

ІКОНА БОЖАЙ МАЦІ «ГРУЗДАЎСКАЯ»

Калі вы трапіце ў вёску Груздава, што на Маладзечаншчыне, то вам абавязкова раскажуць легенду пра з'яўленне ў мясцовым храме шанаванай іконы. Сёлета святкуецца яе 575-годдзе.

гу сялян, але сам быў перакананы, што абавязаны сваім выратаваннем міласціваму заступніцтву Прасвятой Багародзіцы.

Праз некаторы час Андрэй Саковіч, які быў княжацкім намеснікам у Смаленску, прывёз адтуль драўляны зруб і паставіў на месцы свайго выратавання капліцу, там і размясціў святы вобраз. Пазней каля капліцы ён пабудаваў царкву і перанёс туды ікону. Літоўскі летапіс паведамляе, што ў 1432-1440 гадах Андрэй Саковіч сапраўды з'яўляўся старастам Смаленскім. У фундушовай грамаце 1443 года «Andreas Sakowicz, heres de Gruzdowo» выступае як апякун храма Святой Троіцы ў вёсцы Груздава і ктытар, які надаваў царкве землі і іншую маёмасць.

У XVII–XVIII стст. царква належала уніятам. Царкоўны будынак неаднаразова перабудоўваўся, але на працягу больш чым 500 гадоў тут захоўвалася шанаваная святыня. Мясцовыя старажылы расказваюць, што даўней да іконы прыязджалі паломнікі нават з Украіны, Балгарыі і Чэхіі. Святкаванне іконы адбывалася штогод 15 ліпеня (новы ст.) пры вялікім сцячэнні народу.

Пасля ўз'яднання уніятаў з Праваслаўем (1839) мураваны будынак царквы знаходзіўся ў гаротным стане. Мясцовы святар Мікалай Каладніцкі ў лісце, надрукаваным у 1864 годзе ў «Літоўскіх епархіяльных ведамасцях», апісваў царкву як надзвычай бедную і старую: «Здаецца, яна пагражае сваімі руінамі задушыць кожнага, хто набліжаецца да яе», — з сумам пісаў настаяцель. Аварыйны стан будынка выклікаў неабходнасць пабудовы новай царквы, гэта і адбылося ў 1871 годзе. Новы будынак быў узведзены з дрэва на месцы былой мураванай. Разам з Груздаўскай Рыза-Палажэнскай царквой прыход аб'ядноўваў Палачанскую царкву ў гонар Нараджэння Багародзіцы, пабудаваную ў 1866 годзе. Таму прыход, які тады адносіўся да Валожынскага благачыння, насіў назву Груздава-Палачанскі. У канцы XIX ст. настаяцелем прыхода быў святар Леў Шчансновіч, у гэты ж час тут была заснавана царкоўна-прыходская школа. З 1943 па 1948 гады на Груздава-Палачанскім прыходзе служыў айцец Генадзій Яблонскі, які пазней быў настаяцелем Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора ў Гродне.

На жаль, Груздаўская царква не пазбегла лёсу многіх зняважаных святыняў Беларусі падчас ганенняў на царкву ў 1960-я гады. Тады прыход абслугоўваў святар Уладзімір Урлік. У 1962 годзе царква была зачынена, а прыход далучаны да Маладзечанскага. Падчас гвалтоўнага закрыцця царквы ў 1962 годзе іконы, кнігі, царкоўныя рэчы былі скінуты ў роў, звон разбіты і затоплены ў вадзе. Пад наглядам міліцыі, каб не дапусціць хваляванняў, з царквы быў сарваны крыж. Царкоўны будынак выкарыстоўваўся пад гаспадарчыя патрэбы мясцовым калгасам. Жыватворная крынічка, якая выцякала з паўночнага боку ад царкоўнага будынка, была закапана.

Груздаўскі храм

Прыхаджане імкнуліся захаваць хаця б частку царкоўнай маёмасці. Прыхаджанка Марыя Фалей схавала напрастольнае Евангелле, якое пазней перадала ў Палачанскую царкву. Найбольшая святыня — Груздаўская ікона Божай Маці — таксама захоўвалася спачатку ў прыхаджан, а пасля была перададзена ў Маладзечанскую царкву. Каля спустошанага храма людзі знайшлі лісткі царкоўнага летапісу, які вёўся настаяцелямі з сярэдзіны XIX стагоддзя. Там яны і прачыталі старажытнае паданне аб узнікненні царквы. Але дзе знаходзіцца летапіс цяпер — невядома.

У 1994 годзе ў Груздаве адноўлена праваслаўная абшчына. Драўляная царква знаходзілася ў аварыйным стане, але агульнымі намаганнямі вернікаў адрамантавана і ўпрыгожана. Шчыра папрацавалі на аднаўленне святыні протаіерэй Грыгорый Папоў, цяперашні настаяцель айцец Анатолій Папоў, старшыня калгаса «Палачанскі» А. Мучынскі, а таксама В. Бажко, Л. Туронак, С. Антонаў, жыхары Груздава і навакольных вёсак. Пасля завяршэння работ у храм быў вернуты шанаваны вобраз Маці Божай. Да Груздаўскай іконы Багародзіцы, як і раней, прыязджаюць паломнікі. З боку ад храма знаходзяцца фундамент і драўляны крыж — так адзначана тое месца, дзе знаходзілася каплічка, пастаўленая некалі князем Андрэем Саковічам.

Уладзімір КУЛАЖАНКА
Фота Дзмітрыя ПАПОВА

17 июля 90 лет со дня мученической гибели царской семьи

Страстотерпец Николай II:

«НЕТ ТОЙ ЖЕРТВЫ, КОТОРУЮ Я НЕ ПРИНЕС БЫ ВО ИМЯ ДЕЙСТВИТЕЛЬНОГО БЛАГА И ДЛЯ СПАСЕНИЯ РОССИИ»

«В последнем православном российском монархе и членах его семьи мы видим людей, искренне стремившихся воплотить в своей жизни заповеди Евангелия. В страданиях, перенесенных царской семьей в заточении с кротостью, терпением и смирением, в их кончине 4/17 июля 1918 года был явлен побеждающий зло свет Христовой веры подобно тому, как он воссиял в жизни и смерти миллионов православных христиан, претерпевших гонение за Христа в XX веке», — сказано в Деянии Архиерейского Собора 2000 года, на котором император Николай II, императрица Александра Феодоровна, цесаревич Алексей, великие княжны Ольга Николаевна, Татьяна Николаевна, Мария Николаевна, Анастасия Николаевна были прославлены как страстотерпцы в сонме новомучеников и исповедников Российских.

Тропарь, глас 4:

Днесь, благовернии людие, светло почтим/ седмерицу честную царственных страстотерпец,/ Христову едину домашнюю Церковь:/ Николая и Александру,/ Алексия, Ольгу, Татиану, Марию и Анастасию./ Тии бо, уз и страданий многоразличных не убоявшеся,/ от богоборных смерть и поругание телес прияша/ и дерзновение ко Господу в молитве улучиша./ Сего ради к ним с любовию возопиим:/ о святии страстотерпцы,/ гласу покаяния и стенанию народа нашего вонмите,/ землю Российскую в любви к Православию утвердите,/ от междоусобныя брани сохраните,/ мир мирови у Бога испросите// и душам нашим велию милость.

Первые годы царствования императора Николая II были благоприятными и, казалось, обещали России процветание. Император выступил с инициативой созыва международной конференции мира, которая была проведена в Гааге в 1899 году. Конференция определила принцип мирного разрешения международных конфликтов. Сколь же трагичным оказалось то, что на его долю выпало вести кровопролитные войны!

В правление Николая II Россия неуклонно становилась великой индустриальной державой: за 20 лет производительность русской промышленности увеличилась вчетверо. Россия являлась тогда кормилицей всей Европы: в 1913 году урожай хлеба был на треть выше, чем в США, Канаде и Аргентине вместе взятых. Росло народонаселение. Российский рубль был подлинно золотым, ведь денежное обращение более чем на 100 процентов обеспечивалось золотой наличностью.

К России Николай II относился не сентиментально, но религиозно: служение Родине для него не отделялось от служения Богу.

Исключительно много святой император сделал для Православной Церкви. При нем число храмов и монастырей увеличилось более чем на десять тысяч. В его царствование было прославлено восемь святых, в числе которых великий чудотворец и молитвенник преподобный Серафим Саровский. Сразу после кончины святого Иоанна Кронштадтского царь предсказал, что батюшка Иоанн впоследствии будет прославлен, и установил день молитвенного поминовения кронштадтского пастыря.

У царственной четы было четверо горячо любимых дочерей, но России нужен был наследник престола. Государыня усердно молила Бога о ниспослании сына, и после посещения Сарова, в дни торжеств прославления преподобного Серафима, Господь внял мольбам святой императрицы. Наследник родился в 1904 году, но радость длилась недолго. Вскоре обнаружилось, что царевич Алексей болен страшной неизлечимой болезнью — гемофилией.

В феврале 1917 года, воспользовавшись отсутствием государя в столице, усилила свою деятельность оппозиционная аристократия. При дворе стали поговаривать о целесообразности дворцового переворота. Телеграммы с требованием отречения императора присылали многие командующие фронтов. И когда произошел февральский переворот, даже ближайшее окружение Николая II стало уверять его, что отречение спасет Россию. Перед лицом измены государь пожертвовал собой. Это случилось 2 марта. «Нет той жертвы, которую я не принес бы во имя действительного блага и для спасения России. Посему я готов отречься от престола», — такую телеграмму царь дал председателю Думы.

Вскоре государь с семьей оказался под стражей в Царском Селе. 31 июля начался мученический путь царской семьи: они были отправлены в Тобольск, а оттуда в Екатеринбург. В страданиях дух царственных мучеников возрастал и крепнул. «Путь Божий есть ежедневный крест», — записала в свой дневник царица слова преподобного Исаака Сирина. И еще высказывание из Макария Великого: «Христиане должны переносить скорби и внешние и внутренние брани, чтобы, принимая удары на себя, побеждать терпением. Таков путь Христианства». То же настроение — в стихотворении, которое великая княжна Ольга переписала в начале 1918 года:

Пошли нам, Господи, терпенье
В годину буйных, мрачных дней
Сносить народное гоненье
И пытки наших палачей.

Дай крепость нам, о Боже правый,
Злодейства ближнего прощать
И крест тяжелый и кровавый
С Твоею кротостью встречать.

И в дни мятежного волненья,
Когда ограбят нас враги,
Терпеть позор и оскорбленья,
Христос-Спаситель, помоги!

Владыка мира, Бог вселенной,
Благослови молитвой нас
И дай покой душе смиренной
В невыразимый смертный час!

И у преддверия могилы
Вдохни в уста Твоих рабов
Нечеловеческие силы
Молиться кротко за врагов.

В ночь с 17 на 18 июля 1918 года за ними пришли и отвели в подвал Ипатьевского дома, в котором содержали. В сопровождении солдат вошел комиссар Юровский и объявил о предстоящем расстреле. Государыня успела перекреститься; она была убита сразу, как и государь. Дольше всех мучились царевич Алексей и великая княжна Анастасия: пули не принесли им смерти, и солдаты добивали детей штыками. Доктор Боткин и трое слуг разделили участь царской семьи. Так совершилось злодейское убийство ни в чем не повинных людей, среди которых были ребенок и четыре молодые девушки.

«Еще более должно нас поражать и удручать бесчувствие самого русского народа, с каким он отнесся к страдальческой кончине своего Государя. Когда его невинная кровь, соединившись с кровью его супруги и юных детей, пролилась в мрачном подвале Ипатьевского дома, это потрясающее событие, от которого, казалось, могли содрогнуться самые камни, не вызвало ни ужаса, ни острой скорби в толще русского народа, почти не заметившего его в шуме общих потрясений революции. Царь-мученик остался неосетованным и неоплаканным своими подданными» (митрополит Анастасий (Грибановский)).

Почитание царской семьи, начатое уже святителем Тихоном в заупокойной молитве и слове на панихиде по убиенному императору в московском Казанском соборе через три дня после екатеринбургского убийства, продолжалось на протяжении всего советского периода русской истории, несмотря на жестокие преследования властей.

В барановичском Свято-Покровском соборе в честь царственных страстотерпцев и в память о неоднократном пребывании Николая II в городе освящен придел.

Также при Вознесенском приходе в Ждановичах в санатории «Беларусь» есть домовый храм в честь страстотерпца цесаревича Алексея.

К Царственным страстотерпцам многие христиане обращаются сегодня с молитвой об укреплении семьи и воспитании детей в вере и благочестии, о сохранении их чистоты и целомудрия — ведь во время гонений императорская семья была особенно сплоченной, пронесла несокрушимую веру православную чрез все скорби и страдания.

Вознесем же и мы в этот день свои молитвы к святому царю и его семье, чтобы не оставляли они нас в испытаниях молитвами своими.

Подготовил Сергей ОРЛОВ

6 июля

САНКТ-ПЕТЕРБУРГ

На колокольню Петропавловского собора Санкт-Петербурга будут водить экскурсантов. Государственный музей истории Санкт-Петербурга, в ведении которого в настоящее время находится Петропавловский собор, приглашает петербуржцев и гостей города подняться на колокольню храма. Услуга будет действовать с начала июля до середины сентября. Как сообщает пресс-служба музея, новый экскурсионный маршрут будет включать в себя подъем на колокольню собора на высоту в 42 метра, в ходе которого посетителям расскажут историю строительства крепости и собора и покажут уникальный комплекс колоколов и карильон (музыкальный инструмент, посредством часового механизма заставляющий ряд колоколов исполнять какую-либо мелодию).

Как сообщалось ранее, с начала 2008 года по договору между Государственным музеем истории Санкт-Петербурга и Санкт-Петербургской епархией в Петропавловском соборе возобновились регулярные богослужения. До Пасхи они совершались по великим двунадесятым праздникам, субботам и воскресеньям. Однако в связи с наступлением летнего периода, когда наплыв экскурсантов в храм резко увеличивается, дирекция музея попросила приход вплоть до октября ограничить богослужения по выходным дням. «Мы стараемся, чтобы туристы разговорами и фотовспышками не мешали верующим. Но за год через собор проходит миллион экскурсантов, поэтому службы в нем не могут быть частыми», — пояснил директор музея Александр Колякин.

